же уровня Intermediate.

В заключение, хотелось бы подчеркнуть, что использование кейс-технологии на уроках английского языка способствует: 1) повышению общего уровня владения языком; 2) развитию творческого мышления (заставляет думать на английском языке); 3) развитию умения вести дискуссию, аргументировать свои ответы; 4) совершенствованию навыков чтения и обработки информации на английском языке; 5) развитию навыков работы в команде и принятия коллективных решений; 6) росту самостоятельности учащихся, вырабатыванию ответственности за принятые решения.

**Литература**

1. *Долгоруков А.* Метод case-study как современная технология профессионально-ориентированного обучения // Российское право в Интернете. 2009. № 10 Режим доступа: http://www.vshu.ru/lections.php?tab_id=3&a=info&id=2600 Дата доступа: 23.04.2010.
2. *Залогина Т. В.* Общая характеристика кейс-метода (case-study). Роль преподавателя в проведении кейс-метода // Российское право в Интернете. 2009. № 2 Режим доступа: http://rpi.msal.ru/prints/200903zalogina.html Дата доступа: 20.05.2010.
3. *Запрудский Н. И.* Современные школьные технологии: Пособие для учителей. Мн., 2006.
4. *Малинина М.* «Метод case-study в неформальном образовании/М.Малинина//Адукатар. 2009. №2. С. 2–8 Режим доступа: http://adukatar.net/wp-content/uploads/2009/12/Adukatar_2_Pages_2-8.pdf Дата доступа: 13.03.2010.
5. *Сурмин Ю., Сидоренко А., Лобода В., Фурда А., Катерыняк И., Меер К.* Ситуационный анализ, или Анатомия Кейс-метода; Под ред. Сурмина Ю.П. Киев, 2002.

# ЦАЦКІ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ

**Г. Д. Жаўняровіч**

Бясспрэчна, што ўсе важнейшыя ўласцівасці асобы закладваюцца ў дзяцінстве. Таму на гэтым этапе вялікае значэнне маюць усе фактары. Адным з такіх чыннікаў, што ўплываюць на дзіця з самага пачатку яго пазнавальнай дзейнасці, з'яўляюцца цацкі. Іх педагагічны эфект быў заўважаны вельмі даўно. У гэтым даследаванні зроблена спроба разгляду месца традыцыйнай цацкі ў сістэме беларускай народнай педагогікі, разнастайнасць яе формаў, задачы, ускладзеныя на яе, спосабы яе выкарыстання і іншыя аспекты.

Цацка – прадмет, прызначаны для дзіцячых гульняў, які дае ўяўленне пра рэчы і вобразы, дапамагаючы дзіцяці пазнаваць навакольны свет і з'яўляецца адным са сродкаў разумовага, эстэтычнага і фізічнага выхавання. Змест і знешні выгляд цацкі вызначаюцца канкрэтнымі выхаваўчымі задачамі ў адпаведнасці з узростам, развіццём і інтарэсамі дзіцяці (адрозніваюць дыдактычныя, тэхнічныя, тэатральныя, музычныя, спартыўныя цацкі, а таксама цацкі-забаўкі). Цацка заўсёды нясе на сябе

адбітак сацыяльнага ладу грамадства, узроўню яго культуры, нацыянальных мастацкіх традыцый і эстэтычных запатрабаванняў. Цацкі выкарыстоўваюцца таксама як сувеніры і мастацкія вырабы для аздаблення інтэр'ераў.

На Беларусі самымі старажытнымі і распаўсюджанымі былі гліняныя цацкі, пустацелыя гліняныя шарыкі, яйкі з каменным шарыкам унутры, фігурныя цацкі свістулькі. Верагодна, гэтыя цацкі ў старажытныя часы мелі таксама і рытуальнае прызначэнне: свіст ці бразгаценне павінны былі адганяць злых духаў. Фігуркі людзей, якія абазначалі продкаў, хатніх жывёл, ляпілі з надзеяй паўплываць на дабрабыт сям'і. Масавы выраб гліняных цацак пачаўся ў XI–XIII стагодзях разам з развіццём ганчарства. Свістулькі рабіліся ў выглядзе птушак і конікаў, ляпілі фігуркі людзей. Яны вызначаюцца умоўнасцю форм і вобразаў, створаныя прасцейшымі прыёмамі лепкі. Сярод знаходак XVI–XVII стагоддзяў сустракаюцца вырабы, ўпрыгожаныя зялёнай, карычневай, празрыстай палівай. Свайго росквіту мастацтва глінянай цацкі дасягнула ў XIX – першай палове XX стагоддзя, калі цацкі выраблялiся практычна ва ўсіх ганчарных цэнтрах Беларусі. Для большасці цацак характэрна выпрацаваная яшчэ ў старажынасці стылістыка – абагуленасць, стылізаванасць і ўмоўнасць форм. Звычайна іх пакрывалі зялёнай, карычневай або жоўтай палівай, а ў традыцыйных цэнтрах чорна-задымленай керамікі цацкі таксама мелі чорны колер. З канца XIX стагоддзя пашыраецца таксама цацка наіўна-рэалістычнага характару, у якіх дакладна і падрабязна мадэляваныя фігуркі жывёл, людзей у тагачасным адзенні, часта ў нескладаным дзеянні.

Значнае пашырэнне ў народным побыце мела драўляная цацка, звычайна з імітацыяй рухаў ці дзеяння. Тут пыталіся як бы ажавіць цацку. Папулярнымі былі пілавальшчыкі. Для пілавальшчыка-адзіночкі з дошчачкі выстругвалі схематычны сілуэт чалавечай фігуры, у плечы ўстаўлялі дзве палачкі-рукі, а ў іх жорстка мацавалі «пілу» з трэскі. Ніжні завостраны канец цацкі ўтыкалі ў бульбіну, якая служыла процівагай. Цацку ставілі на край стала і яна паціху пагойдвалася – «пілавала» уяўнае бервяно. Складаней было зрабіць парных пілавальшчыкаў. Адзін стаяў на дошчачцы-аснове, а другі на перакладзіне, што імітавала падстаўку (сталюгу) для распілоўкі бярвенняў. Праз стойкі «сталюгі» і «пілу», за якую трымаліся фігуркі, прапускаўся каленчаты рычажок з дроту. Круціш за рычажок і пілавальшчыкі пілуюць. Дрывасекі ці кавалі (мядзведзь і каваль) рабіліся на гарызантальных палачках. На верхняй – адзін, на ніжняй – другі. Пасоўваеш палачкі ўправа-улева, і кавалі па чарзе б'юць па «кавадле».

Акрамя такіх рухаючыхся драўляных цацак рабілі і іншыя. Такія, напрыклад, як цацкі-птушкі. Іх падвешвалі над дзіцячымі калыскамі і

яны «лятялі» ад павеваў паветра. Тулава такой птушкі рабілі з цуркі апрацаванай накшталт птушынага цела, хвастом была тая ж цурка, рашчэпленая на канцы на лучыны. Крылы рабілі таксама як і хвост толькі з другой цуркі.

У канцы XIX – пачатку XX стагоддзя выраб драўлянай цацкі меў характар промыслу. Яе прадавалі на кірмашах, вывозілі за межы Беларусі. Вырабы людзей і жывёл трактаваліся звычайна схематычна, ўмоўна. Часам вырабы мелі нескладаную расфарбоўку, а фігуркі людзей аздабляліся кавалачкамі тканіны.

Пэўнае распаўсюджанне атрымалі цацкі з саломы. Іх рабілі з аднаго-двух па-рознаму слкадзеных і перавязаных саламяных пучкоў. Гэта былі розныя фігуркі: людзі, птушкі, жывёлы. Сюды ж можна аднесці і так званых «павукоў». Гэта даволі аб’емныя, але легкія вырабы. З асобных саломінак сплятаці геаметрычныя фігуры. Гэтыя фігуры мелі ў асноўным рытуальны сэнс.

Таксама выраблялі лялькі – фігуркі чалавека. Іх рабілі з драўлянай цуркі, што была асновай, да яе мацавалі валасы з кудзелі, вуглём малявалі твар, а з кавалка тканіны шылі аденне. Акрамя гэтага выраблялі цацкачную мэблю, посуд, прылады працы.

Для вырабу цацак выкарыстоўвалі таксама лучынкі, шышкі, жалуды, розныя тканіны.

Набор цацак у сялянскіх дзяцей у XIX – сярэдзіне XX стагоддзя быў вельмі сціплы. Пакупная цацка рэдка трапляла ў дзіцячы быт і была сапраўдным цудам. Цацкі былі самаробныя, зладжаныя бацькамі ці старэйшымі дзецьмі. Падрастаючы, дзеці самі рабілі сабе цацкі. Найбольш пашыранай ў дзяцей малодшага ўзросту, асабліва ў дзяўчат, была лялька з анучы. Добра зробленая, яна нярэдка была любай усім дзецям у сям’і і перадавалася «у спадчыну». Звычайна ляльку шылі з тканіны, паперы. Валасы рабілі з кудзелі, воўны, нітак ці конскага воласа. Шылі і адзенне для лялек, нярэдка вельмі ўмоўнае, недэталізаванае. Хоць былі майстрыхі, якія рабілі сапраўдны касцюм, што насілі ў дадзенай мясцовасці, толькі маленькіх памераў. Рабілі лялькі і з гліны, кары дрэва. Яшчэ адзін абавязковы прадмет для дзіцячых гульняў – мячык – валялі з воўны. Мячыкі рабілі і з анучаў, якія, як і поўсць, прапітвалі дзёгцем.

Роля цацак заключалася ў тым, што яны рыхтавалі мысленне дзіцяці да вытворчай дзейнасці. Цацкі дапамагалі замацоўваць сувязь з традыцыйнай бытавой культурай, засвойваць розныя аперацыі і ўсведамляць розніцу палоў. Дзяўчынкі, гуляючы з лялькамі, посудам, вучыліся даглядаць маленькіх, шыць, выконваць іншыя бытавыя аперацыі, якія ў будучым спатрэбяцца жанчыне. Хлопчыкі, выкарыстоўваючы ў сваіх гульнях цацкі ў выглядзе прылад працы (плуг,

барана, лапата і г.д.), атрымлівалі першыя навыкі сельскагаспадарчай працы мужчыны-селяніна.

Немаўляці яшчэ да таго, як яно пачынала самастойна сядзець, давалі розныя цацкі, каб яно не плакала. «Цацкай» была і хлебная корка, пернік, сухарык, абаранак, кавалак морквы, бручкі, рэпы або маленькая цурачка, костачка і інш. «Чым бы дзіцёнак ні бавіўся, абы не плакаў» – так лічылася ў народзе. Калі ж цацкі ў руках не было, дзіця гуляла са сваімі ручкамі, ножкамі: перабірала пальчыкі, ссала іх. Па народнай прымеце такое дзіця лічылі недаўгавечным, а таму стараліся прадухіліць такія заняткі і давалі яму цацкі ці забаўляльныя прадметы. У сялянскай сям'і цацкам не прыдавалі выхаваўча-развіваючае значэнне. Перш за ўсё трэба было на нейкі час забавіць дзіця, каб мець магчымасць справіцца з хатняй працай.

Ведаючы, што кожны прадмет або цацку, якія трапялі ў рукі маленькіх, яны без разбору цягнуць у рот, маці старалася даваць тыя, што не пашкодзяць ім, папярэдне памыўшы ці выцершы іх.

Першыя гульні дзіцяці, якое самастойна магло сядзець, а потым і станавіцца на ножкі, былі звязаны з лялькай. Маці ці старэйшыя дзеці, падаючы такую цацку, казалі дзіцяці, што гэта «лялька», і паказвалі, як яе «няньчыць». Дзіця засвойвала першыя паняцці: «ляля» есць, п'е, ходзіць, размаўляе, спіць і г.д.

Гульня з цацкамі вельмі захапляла дзіця, і маці ў гэты час магла займацца хатнімі справамі. Таму, пачынаючы з калыскі, малому давалі для забаўкі самаробныя цацкі або прадметы, якія б не былі вострымі, калючымі, каб яно не зрабіла сабе шкоды. Немаўля магло працяглы час гуляць з такімі прадметамі-цацкамі. Час ад часу маці ці старэйшая дзеці падыходзілі да яго, каб зноў даць згубленую цацку ў маленькія ручкі – «лапуркі».

Падрастаючы, дзіця пачынае разумець, што не кожны прадмет, з якім яно гуляе, «смачны». На другі год жыцця дзеці пачынаюць ужо гуляць з цацкамі больш свядома. Дзяўчынкі апранаюць ляльку або звычайную цурку, якая выконвае яе ролю, у «сукенку», «спавівае», «корміць» ляльку. «Лялькай» дзіця называе ўсё, што падобна на людзей («ляля ідзе»).

Усе астатнія прадметы гульні ў маленькіх называліся «цацкі, цацы, цыцынькі, цацунькі». Як адзначалася, цацак «мануфактурнага» паходжання ў сялянскіх дзяцей амаль не было. Як правіла, цацкі дзеці рабілі самі альбо з дапамогай старэйшых дзяцей ці бацькоў. Што датычыць гульні «у лялькі», то звычайна ў яе гулялі дзяўчынкі, пачынаючы з маленькага ўзросту да падлеткавага, а то і пазней. Забавай хлопчыкаў лялька была толькі ў перыяд маленства.

Такім чынам, варта адзначыць важнае месца цацкі ў народнай педагогіцы. Яна спрыяла сацыялізацыі асобы, рыхтавала дзіця да ўспрыняцця дарослага жыцця. Праз гульню дзіця спасцігала свет, мадэлявала розныя з'явы рэчаіснасці. Яшчэ цацка давала прастор

творчаму і эстэтычнаму развіццю асобы. Акрамя выхаваўчага значэння, яна часта мела і магічны, абарончы сэнс. Народная цацка і сёння мае педагагічнае значэнне, выконваючы, акрамя ўсяго пералічанага, функцыю далучэння новых пакаленняў да традыцыйнай культуры беларускага народа, што так важна ў сучасным глабалізаваным свеце.

**Літаратура**


1. *Ракава Л. В.* Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы. / Л.В.Ракава – Мн.: «Ураджай», 2000. – с. 111.
2. *Сахута Я.* Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: 2-ое выд., перапрац. і дап. / Я. Сахута. – Мн.: Беларусь, 2001. – с. 110.
3. *Грымаць А. А.* Метад. дапам. / А.А.Грымаць, Л.М.Варанецкая, У.В.Пашкевіч. – Народная педагогіка беларусаў. – Мн.: Выд. Ул. М. Скакун, 1999. – с. 256.
4. *Сахута Я.* Народнае мастацтва Беларусі. – Мн.: БелЭн, 1997. – с. 287.


## САМОСТОЯТЕЛЬНАЯ РАБОТА КАК ВЕДУЩАЯ ФОРМА ОРГАНИЗАЦИИ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ СТУДЕНТОВ ЗАОЧНОГО ОТДЕЛЕНИЯ ВУЗА


**М. Ю. Зинченко**


На макроуровне одной из основных наряду с очной формой организации обучения в вузе выступает заочная форма получения образования. При практическом осуществлении обучения на заочном отделении объем непосредственных контактов студентов и преподавателей и аудиторных занятий резко снижен, предусмотрен в основном рубежный и выпускной контроль, объем изучаемого материала неизбежно редуцирован. При этом объем и тематика знаний и умений для обязательного усвоения студентами задается практически в тех же пределах что и для студентов стационара. Исходя из этой специфики, заочной форме подготовки специалистов, несмотря на ее массовость, в большинстве случаев отводиться второстепенная роль и значение. В таких условиях дидактическая и воспитательная система заочного обучения в рамках университета зачастую недостаточно реализует свой потенциал как в аспекте профессионального так и личностного развития студентов. Общепризнанно, что наиболее значительные изменения в личности студента происходят под влиянием тех факторов и условий, которые возникают в ведущих видах деятельности. Ведущей же формой совместной деятельности в системе высшего образования является учебно-познавательная деятельность. То, в каких формах и условиях протекает эта деятельность студентов, в значительной степени определяет их социальное и профессиональное становление. В отличие от студентов стационара, которые включены в различные виды деятельности (общественную, спортивную, научно-исследовательскую, культурно-развлекательную), студенты заочной формы обучения проводят в стенах университета весьма ограниченный период вре-